Як бачым, у значнай частцы выпадкаў немагчымасць утварэння прыслоўяў ад прыметнікаў абумоўлена самой прыродай з'яў, якія характарызуюцца прыслоўямі, гэта значыць, атрымлівае тлумачэнне на дэнататыўным узроўні.

[1] Гл.: Клычков Г. С. // Вестн. МГУ. Сер. истор.-филолог. 1958. № 2.
[2] Гл.: Граматыка беларускай мовы. Мн., 1962. Т. 1. С. 162; 419—420; Беларуская граматыка. Мн., 1985. Ч. 1. С. 105 і наст.; 196—197.
[3] Гл.: Колшанский Г. В. Соотношение субъективных и объективных факторов в языке. М., 1975. С. 102—103; Солнцев В. М. Язык как системно-структурное образование. М., 1971. С. 302—303.

Т. Р. РАМЗА

## БЕЗАСАБОВЫЯ СКАЗЫ І ІХ АДМЕТНЫЯ АДЗНАКІ

Праблема безасабовых сказаў з'яўляецца адной з найбольш спрэчных у сінтаксічнай навуцы. Гэта тлумачыцца тым, што сінтаксічная асоба — комплексная катэгорыя, якая ахоплівае адначасова розныя ўзроўні сказа, а таксама тым, што размежаванне аднасастаўных і двухсастаўных сказаў не мае адназначнага рашэння.

Ужыванне безасабовых сказаў, шматлікасць і своеасаблівасць іх тыпаў даўно прыцягваюць увагу даследчыкаў. Гісторыя вывучэння гэтых сказаў у лінгвістычнай літаратуры багатая і плённая. Разам з тым і ў агульнай інтэрпрэтацыі прыроды безасабовасці і ў класіфікацыі безасабовых сказаў, і іх семантычнай характарыстыцы застаюцца спрэчныя, не да канца вырашаныя пытанні.

Як вядома, да безасабовых сказаў адносяцца такія «аднасастаўныя сказы, галоўны член якіх абазначае дзеянне ці стан незалежна ад вытворцы дзеяння (ці носьбіта прыметы)»[1]. Такое азначэнне ахоплівае фактычна толькі адну групу безасабовых сказаў, у якіх граматычным цэнтрам выступаюць уласна безасабовыя дзеясловы ці безасабова-прэдыкатыўныя словы, якія абазначаюць стан акаляючага асяроддзя. Пэўныя групы сказаў, што ўваходзяць у разрад безасабовых, абазначаюць стан ці прымету, якія ўвогуле не асэнсоўваюцца ў адрыве ад суб'екта — іх носьбіта. Назва «безасабовыя» дадзена сказам такога тыпу на падставе структурных прымет: гэта аднасастаўныя сказы, якія не маюць і не могуць мець незалежнага назоўнага склону імя ў ролі дзейніка. Паводле ж значэння яны заўсёды асабовыя, паколькі заўсёды абазначаюць душэўны стан якой-небудзь асобы.

Існуюць характарыстыкі безасабовых сказаў, якія абапіраюцца на іх граматычныя асаблівасці ці на канкрэтызацыю значэння і граматычных якасцей іх галоўнага члена, але ж асноўным паказчыкам безасабовых сказаў з'яўляецца немагчымасць абазначэння суб'екта дзеяння ў форме назоўнага склону; таму найбольш карэктным уяўляецца азначэнне Н. С. Валгінай: «Безасабовымі называюцца аднасастаўныя сказы, галоўны член якіх не дапускае абазначэння суб'екта дзеяння ў форме назоўнага склону і называюць працэс ці стан незалежна ад актыўнага дзеяча»[2].

Прывядзем яшчэ і дэфініцыю безасабовых сказаў А. М. Гваздзёва, каб на аснове яе акрэсліць некалькі спрэчных пытанняў, якія існуюць у цяперашні час у вывучэнні безасабовых сказаў: «Безасабовы сказ характарызуецца адсутнасцю дзейніка, які ўвогуле немагчыма ўявіць, і наяўнасцю галоўнага члена, адпаведнага выказніку, але адрознага ад яго тым, што ён не падпарадкаваны дзейніку; такі галоўны член выражаецца ў формах 3-й асобы адзіночнага ліку дзеясловаў, а таксама ў ніякім родзе адзіночнага ліку і ў нязменных словах. (Часам пры маўленні ў якасці няпэўна абазначанага дзеяча ўжываецца слова *яно,* якое адпавядае нямецкаму es і французскаму il у безасабовых сказах)»[3]. Пры параўнанні прыведзенага азначэння і меркаванняў іншых лінгвістаў выяўляюцца такія пытанні: Што стварае прэдыкатыўны цэнтр безаса-

бовага сказа: выказнік ці галоўны член? Ці выражае дзеяслоў безасабовага сказа 3-ю асобу? У якой якасці выступае слова *яно* ў безасабовых сказах?

Услед за А. А. Шахматавым часта робяцца спробы растлумачыць аднасастаўнасць сказаў, зыходзячы з суадносенасці іх членаў з суб'ектам і прэдыкатам лагічнага суджэння. Пры гэтым у адных выпадках захоўваецца інтэрпрэтацыя, блізкая да пункту гледжання Шахматава, і адзіны галоўны член аднасастаўных сказаў разглядаецца як выразнік адначасова і суб'екта, і прэдыката суджэння (з гэтай трактоўкі нярэдка вынікае адказ ад граматычнага паняцця «дзейнік» і «выказнік» у адносінах да аднасастаўнага сказа і выкарыстанне недыферэнцаванага тэрміна «галоўны член аднасастаўнага сказа»): «Член сказа, які адпавядае па сваім значэнні спалучэнню суб'екта з прэдыкатам, мы назавём галоўным членам аднасастаўнага сказа»[4]. А. А. Шахматаў, які ўпершыню абгрунтаваў адметнасць аднасастаўных і двухсастаўных сказаў, зазначаў: «Галоўны член аднасастаўных сказаў можна фармальна атаясамліваць ці з дзейнікам, ці з выказнікам, пры гэтым, вядома, не трэба забывацца, што такі «выказнік» адрозніваецца ад выказніка двухсастаўнага сказа тым, што выклікае ўяўленне аб суб'екце і аб прэдыкаце, між тым як выказнік двухсастаўнага сказа адпавядае толькі прэдыкату, а таксама і тое, што «дзейнік» аднасастаўнага сказа выклікае ўяўленне і аб суб'екце і аб прэдыкаце, між тым як дзейнік двухсастаўнага сказа адпавядае толькі суб'екту»[5]. Так выказваецца думка, што адзіны галоўны член аднасастаўнага сказа (тыпу *Восень. Дажджыць*) «не з'яўляецца ні дзейнікам, ні выказнікам, а арыгінальнай формай выражэння суб'екта, прэдыката і звязкі суджэння»[6]. Разглядаючы лагічную прыроду безасабовага сказа, Н. Н. Арват падкрэслівае: «У безасабовым сказе тыпу «светает» дзве лагічныя катэгорыі — суб'ект і прэдыкат — выражаюцца марфалагічна ў адным слове — безасабовым дзеяслове. Невытворная аснова такога дзеяслова (ці кораня) з'яўляецца па паходжанню назоўнікам, яна заключае ў сабе паняцце, якое адпавядае суб'екту». Далей даследчыца зазначае, што «ўсе абсалютна безасабовыя дзеясловы ўтварыліся ад іменных асноў: *вечер — вечереет, метель — метет, полегчало — легче* (легкий), *нездоровится — здоровый* и т. д.»[7]. Таму, раскрываючы змест безасабовых сказаў тыпу «светает» двухсастаўнай канструкцыяй «наступает свет», паняцце лагічнага суб'екта мы выражаем словам, якое этымалагічна адпавядае вытворнай аснове безасабовага дзеяслова (*свет — свет-а-ет, свет-а-л-о*). Іншага лагічнага суб'екта ў такіх безасабовых сказах не дапускаецца.

А. А. Юдзін, разглядаючы пытанне аб аднасастаўных сказах, усе безасабовыя сказы падзяляе на 2 групы: 1) суб'ект і прэдыкат лагічнага суджэння выражаюцца кожны асобным членам сказа; *Яму блага;* 2) суб'ект і прэдыкат лагічнага суджэння зліваюцца ў адным члене сказа: *Святлее*[8]. Падобнай думкі прытрымліваецца і В. Б. Сірацініна. Яна вылучае «1) безасабовыя канструкцыі, якія перадаюць адносіны да асобы шляхам выкарыстання дэтэрмінантаў, канструктыўна абумоўленых форм давальнага і вінавальнага склонаў: *Меня знобит; У меня нет денег;* 2) безасабовыя канструкцыі, звязаныя з перадачай адмаўлення асобы, значэннем не-асобы (*Холодает; Рассвело; Тепло*)»[9]. На аснове суаднесенасці агульнага і адметнага выказніка і адзінага галоўнага члена аднасастаўнага сказа з паняццем прэдыкатыўнасці яна вызначае спецыфіку безасабовых сказаў, дзе «ёсць прэдыкатыўнасць, але няма прэдыкатыўных адносін, гэта значыць суаднесенасці прыметы з дзейнікам». Прызнанне ўзаемазалежнасці дзейніка і выказніка прыводзіць В. Б. Сірацініну да неабходнасці выдзялення галоўнага члена аднасастаўнага сказа. На яе думку, «гэты член мае шмат агульнага з выказнікам: як і выказнік, ён з'яўляецца носьбітам усіх 3-х граматычных катэгорый прэдыкатыўнасці; мае тыя ж тыпы. Але ў адрозненне ад выказніка галоўны член аднасастаўнага сказа з'яўляецца адзіным галоўным членам, які ні з якім іншым не каардынуецца». «Выказнікам яго не называюць, таму што ён не вызначае дзейніка, а з'яўляецца фармальна

незалежным членам»[10]. Такой жа думкі прытрымліваецца і Б. П. Ардэнтаў, які называе галоўны член намінатыўных сказаў «подлежащным членом», а галоўны член безасабовага сказа — «сказуемостным членом». «Усё ж такі галоўны член намінатыўнага сказа, — піша ён, — нельга назваць дзейнікам, а галоўны член безасабовага — выказнікам, таму што дзейнік і выказнік — папарна суадносныя, а наяўнасць аднаго з іх прадугледжвае абавязковую наяўнасць другога»[11]. Менавіта ўказанне не толькі на бяздзейнікавасць безасабовых сказаў (такімі з'яўляюцца пэўна-асабовыя, няпэўна-асабовыя, некаторыя разнавіднасці агульна-асабовых, а таксама няпоўныя асабовыя), а ўказанне на немагчымасць граматычнага дзейніка пры пэўнай (безасабовай) форме выказніка дае падставу замест тэрміна «выказнік» для безасабовых сказаў ужываць тэрмін «галоўны член», які з'яўляецца адзіным галоўным членам у безасабовым сказе. «Граматычныя паняцці «дзейнік» і «выказнік» маюць свой сэнс толькі адносна двухсастаўных сказаў»[12].

Іншыя даследчыкі, у прыватнасці В. В. Бабайцава, сцвярджаюць, што «галоўны член безасабовых сказаў з'яўляецца выказнікам, ён адпавядае прэдыкатыўнаму суджэнню і з'яўляецца вербальным яго выражэннем». Такой жа думкі прытрымліваюцца аўтары «Курса сучаснай беларускай літаратурнай мовы» і «Сінтаксіса сучаснай беларускай мовы».

У радзе выпадкаў у якасці выразнікаў суб'екта разглядаюцца дадатныя члены (дапаўненні, акалічнасці), якія ўстойліва ўжываюцца ў асобных відах аднасастаўных сказаў. Вынікам такой трактоўкі звычайна з'яўляецца атаясамліванне граматычных функцый гэтых дадатных членаў з функцыямі дзейніка двухсастаўных сказаў. Так, Гіро-Вебер падкрэслівае, што традыцыйная «марфалагічная» класіфікацыя простага сказа абапіраецца на тэорыю аб членах сказа і прызнае дзейнікам толькі імя ці іменнае спалучэнне ў назоўным склоне і інфінітыве. Пры аналізе структурна-сэнсавага значэння сказа М. Гіро-Вебер прыходзіць да кардынальна супрацьлеглай высновы: «Ускосная форма імя і недапасаванага члена здольныя спалучацца прэдыкатыўнай сувяззю, таму што яны здольны ўтвараць прэдыкатыўны мінімум сказа». Адсюль вынікае, што іменны кампанент ва ўскосным склоне «мае ранг галоўнага члена, інакш кажучы, з'яўляецца дзейнікам», прычым дзейнік гэты можна назваць сінтаксічным, паколькі «сінтаксічны дзейнік — гэта іменны кампанент у любым склоне, які, спалучаючыся з выказнікам, здольны ўтвараць пры дапамозе пэўнай інтанацыі правільнае і граматычна дастатковае мінімальнае выказванне»[13]. Даследчык лічыць неправамерным разглядаць іменны кампанент ва ўскосным склоне ў сказах тыпу *Отца не было, Мне повезло, С мамой плохо, Дочку тошнит* у якасці пашыральнікаў, спасылаючыся на эксперыментальныя даследаванні А. М. Мухіна, які разглядаючы безасабовыя адмоўныя канструкцыі з родным склонам, устанавіў, што «сувязь паміж гэтым родным і выказнікам сказа нічым не адрозніваецца ад сінтаксічнай сувязі традыцыйнага дзейніка ў назоўным склоне з выказнікам: у абодвух выпадках яна ўзнікае паміж двума ўзаемнапрадказальнымі кампанентамі, здольнымі ўтварыць сказ»[14].

Ці выражае дзеяслоў безасабовага сказа 3-ю асобу? Лічыцца, што «флексія 3-й асобы адзіночнага ліку цяперашняга часу ў літаратурнай мове дапускае два разуменні, два асэнсаванні: яна выражае сувязь дзеяння з пэўнай асобай і прадметам або ўказвае на ліквідаванасць асобы ці прадмета са сферы дзеяння, на безасабовасць»[15]. В. В. Бабайцава ўказвае, што менавіта змешванне граматычнай асобы і асобы-дзеяча прыводзіць да таго, што ў адных выпадках выказнік безасабовага сказа разглядаецца як дзеяслоў у форме 3-й асобы, а ў другіх — як дзеяслоў, які не мае форм асобы, ці як дзеяслоў, які мае форму, адпаведную з формай 3-й асобы адзіночнага ліку, а ў прошлым часе — з формай ніякага роду адзіночнага ліку[16]. Самі па сабе гэтыя формы не змяшчаюць ніякай інфармацыі аб наяўнасці ці адсутнасці суб'екта, але, спалучаючыся з пэўнымі словаформамі, яны сігналізуюць пэўны тып пабудовы

сказа. «Магчымасць абазначэння дзеяння па-за адносінаў да вытворцы дзеяння, як і абазначэнне дзеяння пэўнай асобы ці прадмета, —падкрэслівае В. А. Кірылава, — патэнцыяльна закладзена ў гэтых дзеяслоўных формах, але не рэалізавана як у формах 1-й і 2-й асобаў, якія дапускаюць толькі асабовае ўжыванне»[17]. Калі такія дзеясловы ўжываюцца ў безасабовым значэнні, то яны выключаюцца з сістэмы супрацьпастаўлення па асобах. На думку Ц. П. Ломцева, «гэтыя дзеясловы можна назваць формай 3-й асобы толькі з пункту гледжання марфемнага саставу, але не з пункту гледжання катэгорый асобы, таму што яны выключаны з супрацьпастаўлення форм па асобах»[18]. Менавіта гэта «своеасаблівая сінтаксічная аманімія» перашкаджае вылучэнню безасабовых сказаў толькі па спосабу выражэння галоўнага члена.

Такім чынам, безасабовыя дзеясловы маюць граматычную катэгорыю асобы, бо яны, як і асабовыя, выражаюць дзеянне ў адносінах да суб'екта. «Дзеянне ва ўласным сэнсе немагчыма ўявіць без асобы-дзеяча: ёсць дзеянне — ёсць, значыцца, і тое, што дзейнічае, гэта значыць асоба. Мы хочам сказаць гэтым, што без абазначэння асобы, хаця б самага агульнага, самага няпэўнага абазначэння, дзеяслоў не можа быць дзеясловам»[19]. Але калі асабовыя дзеясловы ўказваюць на наяўнасць суб'екта, то безасабовыя — на яго адсутнасць. Таму дзеяслоўныя формы ў безасабовым ужыванні можна лічыць застыўшымі ў форме 3-й асобы адзіночнага ліку ці ў форме прошлага часу ніякага роду, якія з'яўляюцца амонімамі тоесных асабовых форм дзеяслова. Значыць, у безасабовым сказе галоўны член можа быць выражаны дзеясловам у форме, аналагічнай форме 3-й асобы, але гэта форма 3-й асобы не суадносіцца з формамі 1-й і 2-й асобы, пагэтаму яе нельга лічыць формай 3-й асобы.

Спрэчным з'яўляецца і стаўленне даследчыкаў да слова *яно,* якое ўжываецца ў безасабовых канструкцыях. Ц. П. Ломцеў услед за Патабнёй і Шахматавым лічыць ужыванне *яно, воно, оно* ў безасабовых канструкцыях у функцыі «местоименного подлежащего» і кваліфікуе такія канструкцыі «двухсастаўнымі безасабовымі з дзейнікам *яно*»[20]. Супрацьлеглы пункт погляду выказваў яшчэ А. М. Пяшкоўскі:« ...прысутнасць у многіх безасабовых канструкцыях слоўца *яно* не парушае базасабовасці звароту, таму што з'яўляецца хутчэй за ўсё службовым словам для абазначэння самой безасабовасці, а не дзейнікам»[21]. Падобную пазіцыю займае і Е. С. Істрына: [займеннік яно] «наўрад ці можна прызнаць суб'ектам сказа, а таму і дзейнікам; з ім не звязваецца ніякага колькі-небудзь рэальнага ўяўлення аб тым, што характарызуецца прэдыкатам-выказнікам. Слова гэта хутчэй трэба аднесці да экспрэсіўных слоў, да якіх адносяцца, напрыклад, *хаця, ну, вось, раз* і інш. Яно не мае і чыста канструктыўнага значэння, якое належыць займенніку ў безасабовых сказах заходнееўрапейскіх моў, як французскае il faif chaud, нямецкае es regnet; прычым і ў гэтых мовах il, es нельга прызнаць дзейнікам, паколькі яны не адпавядаюць суб'екту сказа»[22]. В. В. Бабайцава лічыць, што структуры са словам *яно* адносяцца «да пераходных тыпаў, якія сумяшчаюць якасці асабовых і безасабовых сказаў»[23].

Асобныя заўвагі аб наяўнасці фармальнага дзейніка *яно* знаходзім і ў В. С. Юрчанкі, які адзначае, што ў «рускай мове фармальны дзейнік *оно* ўжываецца вельмі рэдка і да таго ж надае сказу асаблівае стылістычнае адценне народнай гаворкі»[24]. У «Граматыцы беларускай мовы» (1966) і ў «Беларускай граматыцы» (1986) гэтае пытанне не знайшло адлюстравання. Толькі ў «Курсе сучаснай беларускай літаратурнай мовы» маецца заўвага, блізкая па сэнсу да пункту гледжання А. М. Пяшкоўскага: «У радзе выпадкаў безасабовыя сказы могуць мець у сваім складзе слова *яно,* дзякуючы якому яны нагадваюць двухсастаўныя сказы: *Так яно і было: Рыгор і Піліп сябравалі даўно* (Т. Хад.). Аднак тут слова *яно* не парушае безасабовасці звароту, бо з'яўляецца хутчэй за ўсё службовым словам для абазначэння самой безасабовасці, а не дзейнікам»[25].

Такім чынам, граматычная прырода безасабовых сказаў пакуль што не мае адназначнага тлумачэння і яшчэ чакае грунтоўнага вырашэння.

[1] Беларуская граматыка. Мн., 1986. Ч. 2. С. 218.
[2] Валгина Н. С., Розенталь Д. Э. Современный русский язык. М., 1987. С. 343.
[3] Гвоздев А. Н. Современный русский литературный язык. М., 1973. Ч. 2. С. 91.
[4] Шахматов А. А. Синтаксис русского языка. Л., 1941. С. 30.
[5] Там жа. С. 50.
[6] Копнин П. В. // Мышление и язык. М., 1957. С. 338—339.
[7] Арват Н. Н. О природе безличных предложений. Черновцы, 1960. С. 10—11.
[8] Юдин А. А. // Уч. зап. Кемерово, 1956. Вып. 1. С. 173.
[9] Сиротинина О. Б. Лекции по синтаксису русского языка. М., 1980. С. 79.
[10] Там жа. С. 54, 74.
[11] Ардентов Б. П. Основы русской грамматики. Кишинев, 1962. С. 47.
[12] Копнин П. В. // Мышление и язык. М., 1957. С. 338.
[13] Гиро-Вебер М. // Вопросы языкознания. 1979. № 6. С. 63, 66.
[14] Мухин А. М. Структура предложений и их модели. Л., 1968. С. 134.
[15] Виноградов В. В. Русский язык. М.; Л., 1947. С. 461.
[16] Гл.: Бабайцева В. В. Односоставные предложения в современном русском языке. М., 1968. С. 55.
[17] Кириллова В. А. // Исследования по современному русскому языку. М., 1970. С. 91.
[18] Ломтев Т. П. Основы синтаксиса современного русского языка. М., 1956. С. 130.
[19] Некрасов Н. П. О значении форм русского глагола. Спб., 1865. С. 107.
[20] Ломтев Т. П. Грамматика белорусского языка. М., 1956. С. 205.
[21] Пешковский А. М. Русский синтаксис в научном освещении. М., 1956. С. 369.
[22] Истрина Е. С. // Уч. зап. Казах. гос. ун-та. 1946. Т. 11. С. 32.
[23] Бабайцева В. В. Односоставные предложения в современном русском языке. М., 1968. С. 129.
[24] Юрченко В. С. Простое предложение в современном русском языке. Саратов, 1972. С. 186.
[25] Курс сучаснай беларускай літаратурнай мовы: Сінтаксіс. Мн., 1959. С. 133.

Д. А. АРЛОЎСКІ

# СЕМАНТЫЧНАЯ ХАРАКТАРЫСТЫКА СУЧАСНАЙ БЕЛАРУСКАЙ АБСТРАКТНАЙ ЛЕКСІКІ

Тэматычную групу абстрактных назоўнікаў можна разглядаць, зыходзячы з выпрацаванай у сучаснай лінгвістыцы канцэпцыі, як лексічную падсістэму. Пры гэтым сістэма ўяўляецца нам у выглядзе сукупнасці элементаў, што маюць унутраныя сувязі, якія ператвараюць гэту сукупнасць у цэласны аб'ект, якасці якога не зводзяцца да сумы якасцей яго кампанентаў.

Словы з абстрактным значэннем займаюць важнае месца ў лексічнай сістэме мовы. Менавіта абстрактная лексіка адлюстроўвае ўзровень інтэлектуальнасці мовы, яе здольнасць перадаваць складаныя (тэарэтычныя, навуковыя) паняцці.

Абстрактная лексіка беларускай мовы вывучана вельмі слаба. Некаторыя пытанні, звязаныя з развіццём гэтага лексічнага пласта, закрануты ў артыкулах У. А. Бобрык, Т. І. Салаўянчык і некаторых іншых[1]. Але пакуль што няма адназначнага вырашэння пытанняў аб складзе абстрактнай лексікі, яе структурна-семантычных асаблівасцях і заканамернасцях ужывання. Больш таго, да нашага часу наогул не вызначаны дастаткова выразныя крытэрыі размежавання канкрэтнай і абстрактнай лексікі, што, безумоўна, ускладняе вылучэнне адпаведных слоў з агульнага лексічнага складу мовы.

Абстрактнасць як семантычная катэгорыя ўласціва ў рознай ступені словам усіх часцін мовы. Звычайна пад абстрактным разумеюць тое, што не нясе ў сабе матэрыяльнага напаўнення. Згодна з гэтым, да абстрактных назоўнікаў можна аднесці тыя, што абазначаюць разнастайныя ўласцівасці, дзеянні, працэсы, якасці, пачуцці, стан, паняцці меры, памеру і іншыя з'явы аб'ектыўнай рэчаіснасці, што, як правіла, не ўспрымаюцца органамі пачуццяў.